# РОЛЯ ЭТНАГРАФІЧНАГА МУЗЕЯ “ПАД СТРЭХАМІ ПРАДЗЕДАЎ” У ФАРМІРАВАННІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Як выхаваць духоўна багатую і ўсебакова развітую асобу, сэнс жыцця якой быў бы цесна звязаны з лёсам народа, краіны? Якія прынцыпы і тэхналогіі для гэтага выкарыстаць? Гэтыя пытанні хвалююць кожнага педагога, таму ўзнікла неабходнасць мэтанакіраванай работы па фарміраванні ў школьнікаў погляду на нацыянальную культуру як на духоўную каштоўнасць народа. Толькі той чалавек, які засвоіў культурныя каштоўнасці сваіх продкаў, зможа актыўна ўплываць на жыццёвыя сітуацыі і аналізаваць стваральную дзейнасць людзей.

* **Нацыянальная ідэнтычнасць** — сукупнасць уяўленняў, пачуццяў і ведаў чалавека аб сваёй прыналежнасці да пэўнай нацыі, а таксама аб сваім месцы і ролі ў жыцці роднага народа.Яна з’яўляецца духоўным здабыткам асобы, складае маральную аснову яго жыццядзейнасці.

Перыяд навучання ва ўстанове сярэдняй адукацыі —найбольш спрыяльны для авалодвання дзецьмі элементамі беларускай народнай культуры. Менавіта ў гэты прамежак жыцця ў дзіцяці працягваецца фарміравацца цікавасць, патрэба да ведаў, якія адпавядаюць яго прыродным і асабістым задаткам, закладваецца трывалы фундамент ведаў.

**На сённяшні дзень, на жаль, назіраецца:**

- адсутнасць штодзённай беларускамоўнай практыкі сярод дзяцей і дарослых;
- бедны слоўнікавы запас;
- маўленне дзяцей знаходзіцца пад моцным уплывам рускай мовы;
- школьнікі недастаткова ведаюць народныя традыцыі, гульні і святы;
- большасць бацькоў, дзеці якіх наведваюць школьную ўстанову, увогуле не звяртаюцца да беларускай народнай культуры, не размаўляюць на роднай мове, не чытаюць сваім дзецям твораў бе ларускай дзіцячай літаратуры.

Адной з асноўных задач выхавання і навучання ДУА "Сярэдняя школа №17 г. Барысава" з’яўляецца шырокае далучэнне дзяцей да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей культуры, а адзін з асноўных прынцыпаў адукацыйнай работы — прынцып цеснай узаемасувязі нацыянальнага і агульначалавечага ў выхаванні. Гэта абумоўлівае зварот да народнай педагогікі, нацыянальных традыцый, фальклору, у тым ліку, сродкамі музея.

Прынцып гуманізацыі адукацыйнага працэсу праяўляецца ў стварэнні ўмоў для развіцця дзіцяці, у забеспячэнні ўзаемасувязі з фальклорам, нацыянальным мастацтвам.

## ЭТНАГРАФІЧНЫ МУЗЕЙ — МЕСЦА ЗАХАВАННЯ НАРОДНАЙ СПАДЧЫНЫ

Для большасці дзяцей Беларусі менавіта з музея і пачынаецца іх грамадзянскае станаўленне. Тут яны ўпершыню пачынаюць асэнсоўваць сваё дачыненне да ўсяго, што адбываецца навокал, а паняцці “Радзіма”, “родны кут”, “любоў да Айчыны” напаўняюцца новым сэнсам.

Кожны чалавек павінен ведаць традыцыі і мову свайго народа, павінен умець спяваць свае народныя песні, шанаваць народныя танцы, ведаць, як спрадвеку праходзілі святы ў нашым краі, любіць свае родныя мясціны, сваю Радзіму — Беларусь.

Галоўная мэта музея — выхаваць школьніка-грамадзяніна, сына сваёй Радзімы, які паважае і ведае спадчыну сваіх бацькоў, гісторыю роднага краю, родную беларускую мову, які шануе і зберагае беларускія традыцыі.

У музеі дзеці судакранаюцца з прадметамі — праўдзівымі сведкамі культурнай спадчыны народа, яго багацця. Гэта забяспечвае высокую эмацыянальнасць успрымання матэрыялу, доказнасць пры яго выкладанні, што робіць выхаваўчы працэс больш дзейсным.

Адна справа — бачыць першабытныя прылады на фотаздымках, а зусім іншая — патрымаць у руках гэтыя рэчы. Можна шмат разоў гаварыць аб прыроднай кемлівасці і спрактыкаванасці нашых продкаў, іх уменні прыстасоўвацца да жыццёвых сітуацый і цяжкасцей, а можна прадэманстраваць дзецям драўляную мянташку, якую выкарыстоўвалі нашы продкі для таго, каб навастрыць касу, і паказаць, як гэта рабілася, як можна дрэвам завастрыць жалеза. Дзеці гэтую кемлівасць і вынаходлівасць абавязкова ацэняць.

Усім вядома, што любы музейны прадмет — гэта прадмет жыцця беларускага народа ў пэўны час, таму яго неабходна берагчы ў памяць аб сваіх продках.

Дзеці з задавальненнем калышуць ляльку ў люльцы, прасуюць бялізну з дапамогай качалкі. Найбольш якаснае грамадзянскае станаўленне асобы дашкольніка адбываецца менавіта праз практычную дзейнасць.

Праз шэраг свят, экскурсій, заняткаў дзеці далучаюцца да гістарычнай спадчыны, захоўваюць усё лепшае, што мае наш народ у сваёй скарбонцы,

прымнажаючы тыя нацыянальныя здабыткі, якія ўжо займела незалежная Беларусь.

Вынікам шматгадовай працы па выхаванню навучэнцаў Дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 17 г. Барысава» з'яўляецца школьны этнаграфічны музей «Пад стрэхамі прадзедаў», які быў заснаваны 23 сакавіка 1999 года. Усяго музейных прадметаў – 1100 (асноўны фонд – 870, дапаможны – 230). У чэрвені 2002 года музею прысвоена званне "Народны".

У стварэнні музея і папаўненні экспанатаў прымала ўдзел не адно пакаленне навучэнцаў і іх бацькоў. Многія навучэнцы прайшлі школу музея: у ролі экскурсаводаў, афарміцеляў, у складзе пошукавай групы. У музеі пастаянна працуе група юных экскурсаводаў, якая праводзіць экскурсіі для дзяцей. Таксама у музеі арганізавана група з вучняў (1-11 класы), якая выконвае беларускія народныя песні і танцы. Пры правядзенні экскурсій, лекцый, тэматычных вячорак часта выкарыстоўваецца музычнае суправаджэнне, прэзентацыі, відэаролікі, інтэрактыўная дошка.

**Асноўныя накірункі работы музея:**

**- Тэматычныя і аглядавыя экскурсіі**
*(«Беларуская хата», «Жыццё і побыт беларусаў»,«Асноўныя заняткі» і інш.)*

**- Лекцыі** *(«Быт беларусаў 20 ст.», «Духоўная культура беларусаў», «Абрады беларусаў», «Беларуская літаратура і фальклор» і інш.)*

**- Мерапрыемствы**
*(класныя і інфармацыйныя гадзіны, тэматычныя вечары, пасядзелкі “У самавара”, абрадавыя гульні)*

**- Семінары** *(«Народная творчасць», «Па сцяжынках беларускага фальклора» і інш.)*

**- Навуковыя даследаванні**

**– Пошукавая дзейнасць**

Нашы вучні прынялі актыўны ўдзел у раённых мерапрыемствах краязначага накірунку. У 2020/2021 былі праведзены конкурсы даследчых работ, дзе Дзячэнка Аксана, вучаніца 11 “А”, класа заняла 3 месца з працай па тэме: “Абрад нараджэння і хрышчэння дзіцяці на Беларусі” і Шчасная Дзіяна, вучаніца 11 “А” класа з працай “Эргонімы г. Барысава” заняла 3 месца.

Актыўны ўдзел прымаюць вучні ў конкурсах вершаў на роднай мове “Акрыляе роднае слова”. У лютым 2021 года вучань 7 “Б” класа Рэут Аляксей заняў 3 месца, расказаўшы верш Кандрата Крапівы “У току”, які быў прысвечаны 125-годдзю з дня нараджэння пісьменніка.

На базе нашага музея настаўнікі беларускай мовы па суботах праводзяць розныя гульні для папулярызацыі беларускай мовы і для захавання традыцый беларускай культуры. Гэта такія гульні як: “Свая гульня”, “Марскі бой”,

“Павуціна”, “Гульня-віктарына па мове і літаратуры”, “Шчаслівы выпадак”, “Пагавары са мной на мове, нашай, роднай…”, “Зямля бацькоў – зямля святая” і інш.

20 лютага 2021 года ў нашым музеі праведзена мерапрыемства, прысвечанае Дню роднай мовы. Там чыталіся вершы беларускіх класікаў і спяваліся беларускія народныя песні. Была праведзена віктрарына сярод вучняў 6-х класаў на веданне беларускай мовы.

20 сакавіка 2021 года адбылося мерапрыемсва “Гуканне вясны”. Там прынялі удзел вучні малодшай школы. На мерапрыемстве спявалі песні, вадзілі карагод, выпякалі жаўранкаў – прадвеснікаў вясны.

Таксама нашы вучні з’яўляюцца актыўнымі удзельнікамі вандровак у розныя музеі Беларусі. За перыяд маёй працы ў школе вучні наведалі “Дзяржаўны музей-дача Янкі Купалы” ў в. Ляўкі Аршанскі раён Віцебскай вобласці, музей Уладзіміра Караткевіча ў г. Орша, Нацыянальны музей імя Якуба Коласа ў Мінску і інш. Па выніках вандровак Адамовіч Уладзіслаў зрабіў дзённік вандроўніка. З ім мы удзельнічалі ў конкурсе “Я гэты край Радзімаю заву”. Вучань заняў 2 месца па выніках сваёй працы.

Навучэнцы з вялікай цікавасцю вывучаюць мінулае роднага краю, знаёмяцца з духоўна-маральнымі каштоўнасцямі, этнаграфічнай спадчынай роднага горада і края.

## ГУМАНІТАРНЫ ПРАЕКТ “ПАД СТРЭХАМІ ПРАДЗЕДАЎ”

***Актуальнасць праекта***:

*Далучэнне навучэнцаў да мовы і культуры свайго края выступае сродкам фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці і грамадзянска-патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення.*

***Мэта праекта:*** *павышэнне патэнцыяла і эфектыўнасці выхаваўчай работы школы праз стварэнне прадметна-этнічнага асяроддзя.*

***Чакаемы вынік:***

*Стварэнне школьнага культурна-асветніцкага цэнтра.*

Такім чынам, музей “Пад стрэхамі прадзедаў” актыўна працуе, каб вучні пашыралі веды аб гістарычным мінулым свайго края, знаёміліся з народнымі традыцыямі, святамі, абрадамі, усведамлялі сябе беларусамі.